Mokslų Akademijos Biblioteka

Цана асобнага нумару 20 гр.

Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 6 Вільня, Пятніца 13 Лютага 1931 г. Год VII (XV)

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрас Рэдакцыі і Адміністрацыі: ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19)
Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран. да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

„Бел КРЫНІЦА" каштуе на год—4 зл., на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл.. Заграніцу ўдвая даражэй.
ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

І культура і палітыка.

Кароткі перагляд найнавейшай мінуўшчыны паказуе, што беларускі адраджэнскі рух ад 1917 году прайшоў два галоўныя пэрыяды, дзьве пары і ўступіў у трэцюю. Пры бліжэйшай ацэнцы гэтай-жа мінуўшчыны ня трудна праканацца, што ў параўнаньні з сучаснасьцяй —была яна парой прыгатаваўчай.

Першы пэрыяд — гэта пара ад вялікай расейскай лютаўскай рэвалюцыі (II, 1917 г.) больш-менш да канца 1926 году. Агульнай рысай гэтага пэрыяду ёсьць рэвалюцыйны, ступянёва аднак патухаючы ўздым і вера ў магчымасьць зьдзейсьненьня ідэалаў, вытвараных у дарэвалюцыйныя часы паняволеньня. З усіх праяваў гэтага пэрыяду найвыразьней выступала палітыка, якая, здавалася, дасьць усё і якая аднак ад празьмернасьці і аднабокасьці хутка выradзілася ў простае палітыканства. Факт гэткага выраджэньня палітыкі — з аднаго боку, і труднасьці з зьдзейсьненьнем высьненых ідэалаў у штодзенным жыцьці — з другога, прымусілі ў свой час Беларусаў шукаць новых формаў, новых шляхоў. Гэтак паўстаў і наверх выплыў кліч: „больш культуры"!

Замыкаецца гэтым першы пэрыяд—„палітычны"—і ўваходзіцца ў другі—„культурніцкі", а не адзін сьніў, што і ў „гаспадарчы". У найлепшай веры ў добры вынік у Зах. Беларусі пачалася праца культурна-прасьветная („Бел. Інст. Гасп. і Культ.", „Т-ва Бел. Шк. і інш.) і нясьмелыя пробы працы гаспадарчай (коопэратывы спажывецкія і крэдытовыя). У рэзультаце гэтай працы на абшары ўсяе Зах. Беларусі маем усяго са тры дзесяткі культ.-прасьветных гурткоў, пару (даслоўна!) спажывецкіх коопэратываў і ніводнай беларускай установы крэдытовай. З урадавых установаў беларускіх рахуюцца няцэлыя два дзесяткі (на ўсю Зах. Беларусь) пачатковых школ, 2 гімназіі (прыватныя з правамі) і адна вучыцельская сэмінарыя.

Гэта адзін бок мэдалю. А другі?

Беларускія масы, а нават большасьць „дыплёмаваных правадыроў," праняўшыся клічам „культуры", сусём закінулі поле працы палітычнай, у найлепшым зразуменьні гэтага слова, пакідаючы поле гэта розным палітыкам і палітыканам небеларускім. Вынікам гэтага аказалася зьменшаньне ліку беларускага палітычнага прадстаўніцтва Зах. Беларусі ў параўнаньні з 14-цьма дэпутатамі ў 1922 г., на 12 — у 1928 г. і на 1-нага — ў 1930 г.

Гэта што да колькасьці. Незраўнана горш аднак прадстаўляецца справа „разьмяніваньня" беларускай палітыкі і ейных афіцыяльных прадстаўнікоў у гэтым-жа часе што да якасьці. Бязхрыбетнасьць большасьці бел. „палітыкаў" давяла да поўнай затраты ў іх беларускай палітычнай лініі, што было і ёсьць у інтэнцыі тых, каторыя „пазваляюць" і намаўляюць да „працы культурнай" і каторыя адначасна „ў імя еднасьці" пакідаюць за сабой манаполь на праграмовую працу палітычную. Калі дадаць да гэтага варункі існаваньня беларускіх культ.-прасьветных і гаспадарчых установаў побач і адначасна з аналёгічнымі ўстановамі польскімі, фактычна змонополізаваўшымі на сябе ўсе дапамогі і субвэнцыі ўрадавыя і самаўрадавыя, дык прыходзімо да яснага вываду, што мала даў Беларусам пэрыяд „палітычны", але і дорага, больш —задорага(!) прышлося нам заплаціць і за жабрачыя здабыткі ў пэрыядзе „культурніцкім". Доказ гэта найлепшы, што як беларуская палітыка ня можа апірацца на чужой культуры, так і беларуская культура ня можа разьвівацца бяз уласнай беларускай палітычнай лініі.

Таму кожнаму мусіць быць зразумела, што ў трэцім пэрыядзе дасьпеліваньня беларускага публічнага жыцьця — нам патрэбна і **свая культура і свая беларуская палітыка.**

Да гаспадарчай і культурнай працы!

Усім цяпер ведама, як цяжка жыць беларускаму народу. Эканамічны крызыс, падаткавы цяжар, беззямельле, адсутнасьць асьветы ў роднай мове, адсутнасьць сваіх коопэратываў і наагул гаспадарчага жыцьця — усё гэта вялікім цяжарам лягло на плечы нашага сялянства.

Дзе-ж ратунак з гэтага цяжкога палажэньня? Дагэтуль наша сялянства спадзявалася помачы са стараны: вось можа прыйдзе якая „перамена", можа кончыцца гэты крызыс, можа зьявіцца які „дзядзька", што ўсім бяду, як рукамі здыме... Але праходзяць гады і палёгкі ня відаць. Калі і зьяўляўся ў вёску які „дзядзька", то толькі на тое, каб атуманіць наш народ, узяць галасы і пайсьці сабе. А наш селянін аставаўся пры сваей бядзе.

Але тут у галовах нашых вяскоўцаў паўставала пытаньне, ці цяпер ёсьць такія „дзядзькі", што памагаюць, ці іх саўсім няма? На гэтае пытаньне быў адказ: няма цяпер „дзядзькаў", што даюць, а толькі ёсьць, што бяруць...

І сапраўды, у гісторыі народаў мы ня відзім, каб прышоў які ратунак са стараны, а кожны народ сам для сябе здабывае лепшую долю. Гэтак здабылі для сябэ народна-культурную самабытнасьць чэхі, палякі, літвіны, латышы і шмат іншых народаў. Ніхто за іх не рабіў, а яны самі за сябе зрабілі.

Гэта няхай будзе навукай і для нас беларусаў. Трэба і нам узяцца да работы: самі для сябе.

Але ад чаго пачаць?

Пачынаць трэба ад культурных здабыткаў. Няхай увесь беларускі народ даведаецца, **хто ён**, няхай палюбіць сваё роднае, няхай вучыць сваіх дзетак чытаць і пісаць па-беларуску, няхай закладае свае школы, коопэратывы, адным словам няхай будуе сваё культурнае і гаспадарчае жыцьцё.

Але як яго будаваць? Рэч ясная, што беларусы рассыпаныя па ўсім краі, каб нават і моцна любілі сваю Бацькаўшчыну, нічога ня зробяць, калі будуць працаваць кожны паасобку, адзін аб другім ня ведаючы. **Да такой работы патрэбна арганізацыя**, якая-б злучыла ўсе беларускія культурныя і эканамічныя сілы.

Такой арганізацыяй ёсьць **Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры**. Гэта арганізацыя мае на мэце разьвіцьцё беларускай культуры і эканомікі. Інстытут не належыць да ніякай партыі, не займаецца палітычнай працай, а толькі хоча заргнізаваць усіх сьведамых беларусаў для культурнай і эканамічнай працы.

Каб усе сьведамыя беларусы ўвайшлі ў гэту арганізацыю, яны стварылі-б магутную сілу, якая дала-б беларускаму руху большую жыцьцёвасьць і паставіла-б яго на моцныя ногі. Падумайце толькі: каб кожны беларус даў на агульныя справы толькі адну залатоўку ў год, то сабралася-б вялікая сума, з якой можна было-б пачынаць работу. Нават каб ня ўсе беларусы, а толькі 100 тысяч найболей сьведамых злажылася па 1 зал., то за гэтыя грошы ўжо можна былоб залажыць банк, коопэратывы, школы і г. д. Як відзім, арганізацыя — гэта вялікая рэч, але кожная арганізацыя вымагае адной рэчы: **дружнасьці**. Трэба ўсім сьведамым беларусам зразумець раз на заўсёды, што ня ў служках у нашых паноў мы здабудзем для сябе лепшую долю і не чакаючы збаўленьня ад вейкага „дзядзькі" са стараны, а толькі працуючы самі для сябе.

Дык да культурнай і эканамічнай працы! Няхай усюды на ўсей Беларусі, дзе ёсьць хоць трох сьведамых беларусаў, якія разумеюць значэньне культурнай і эканамічнай працы для адраджэньня Бацькаўшчыны-Беларусі, будзе гурток Бел. Інстытуту Гаспадаркі і Культуры!

Няхай усе сьведамыя беларусы не пашкадуюць працы і ахвярнасьці для дабра ўсяго народу! С. Б.

Далейшы падзел у Праваслаўнай Царкве.

Як ведаем, за апошнія 10 гадоў Праваслаўная Царква перацярпела ня мала прасьледаваньня звонку, асабліва ад бальшавікоў, а так-жа пражыла і ўнутраны падзел.

У гэтыя часы Праваслаўная Царква пад Польшчай адарвалася ад Маскоўскай мітраполіі заснаваўшы аддзельную — аўтокефальную царкву ў Польшчы на чале з мітрапалітам Дзянісам, улада якога абняла праваслаўе пад Польшчай.

Папярэдні біскуп усяе Літвы — Віленскі і Лідзкі—цяпер мітрапаліт Элеўфэры ўлады Варшаўскае мітраполіі ня прызнаў, астаючыся падпарадкаваным мітраполіі Маскоўскай.

Высланы ў свой час мітрапаліт Элеўфэры з граніцаў Польшчы з багаславенства Маскоўскай мітраполіі асеў у Літве ў Коўне, як мітрапаліт праваслаўя ўва ўсей Літве, не прызнаючы ўлады мітрапаліта Варшаўскага.

У апошнія часы мітрапаліт Элеўфэры атрымаў багаславенства ад Маскоўскай мітраполіі на кіраўніцтва Праваслаўнай царквой на эміграцыі на Захадзе.

Дзеля абняцьця пастырства Праваслаўнае Царквы на эміграцыі мітрапаліт Элеўфэры выехаў з Коўна ў Парыж. Але там напаткаў няпрыхільнасьць да царкоўнай палітыкі Маскоўскай мітраполіі з боку мітрапаліта Эўлогія, які на выращэньне гэнае справы паехаў да Канстантынопальскага патрыярхату.

Уніяцкі біскуп.

Апостальская Сталіца ў мінулым месяцы назначыла візытатарам на Зах. Беларусь і Валыншчыну біскупа Чарнэцкага. Такім чынам уніяты беларусы і ўкраінцы Валыншчыны дачакаліся свайго асобнага біскупа.

Да працы!

Да працы, брацы, стань, хто жыў,
Айчына кліча нас да жніў,
І жаць нам кажа збожжа — плён,
Жанцоў заве са ўсіх старон.
Дык нам пара да працы ўстаць,
Калосься праўды сабіраць.
І хоць так цяжка ў працы той,—
Няхай жанцоў жне цэлы рой!
У працы не баліць далонь,
Хоць смага смаліць, як агонь,
І хоць грыміць і віхар дзьме,
Ня кінем поля працы, —не!
Трымайма-ж сьцяг, каб дух ня ўпаў,
Да працы той сам Бог прызваў.

З беларускага жыцьця.

З Бел. Інстытуту Гасп. і Культуры. На сходзе Рады Інстытуту 8 г. м. адбыліся перавыбары Цэнтральнага Ураду Б. І. Г. і К., склад якога на 1931 г. прадстаўляецца гэтак: 1. старшыня — кс. В. Гадлеўскі, 2. 1-шы віцэ-старшыня — В. Багдановіч, 3. 2-гі віцэ старшыня — інж. Ад. Клімовіч, 4. сэкрэтар — М. Пяцюкевіч, 5. скарбнік — кс. А. Станкевіч, 6—7. сябры ўраду — пасол Ф. Ярэміч і рэд. Я. Пазьняк.

З справаздачы аб дзейнасьці Цэнтр. Ураду Б. І. Г. і К. вынікае, што за 1930 г. былі ім наладжаны: 1. дзьве акадэміі (25-я ўгодкі поэтыцкай творчасьці Янкі Купалы і 30-я ўгодкі сьмерці Францішка Багушэвіча), 2. тры публічныя лекцыі (на дзьве лекцыі адміністрацыя, а нават духоўныя кат. улады не далі дазволу), 3. утрымліваліся дзьве пачатковыя беларускія школы, 4. сарганізаваліся чатыры новыя гурткі Б. І. Г. і К., 5. рабіліся захады дзеля адчыненьня беларускай вучыцельскай сэмінарыі, якую польскія школьныя ўлады аднак узялі ў свае рукі.

На наступны год працы Інстытуту намячаецца між інш. сарганізаваньне сьвяткаваньня 10-х угодкаў сьмерці паэты Андрэя Зязюлі, 5-х угодкаў існаваньня Інстытуту, 15-х угодкаў сьмерці Цёткі, 5-х угодкаў сьмерці К. Сваяка і інш.

Найбольшай перашкодай у працы Інстытуту ў новым годзе ёсьць недахоп грошай. Таму абавязкам Гурткоў Інстытуту ёсьць акуратна прысылаць свае сяброўскія складкі.

Беларускае прадстаўленьне на вёсцы. Дня 1.II.31 г. у в. Сьцягліцы, Вялейскага пав., мясцовая пажарная каманда зладзіла беларускае прадстаўленьне. Адыграны сцэн. творы: „Суд“—Галубка „На вёсцы“—Аляхновіча і прадэклямавана некалькі беларускіх вершаў.

Людзей на спэктаклю было многа. Артысты-аматары выканалі сваеролі даволі добра.

Чэсьць збудзіўшайся і рухлівай моладзі!

З выдавецкае нівы. У мінулым тыдні вышла з друку кніжка—сцэнічны твор „Pieršyja łastaŭki“—І. Рушчанца. Цана гэтай кніжкі 20 грошай. Прадаецца ўва ўсіх беларускіх кнігарнях. Галоўны склад — беларуская кнігарня „Пагоня“ — Вільня, Людвісарская 1.

„Чаму гэта так сталася“. Пад такім загалоўкам Ф. Акінчыц у сваей брашуры высьняе, чаму правадыры бышай „Грамады“ падзяліліся на два кірункі: камуністычны і полёнофільскі.

Лекцыя. У нядзелю 1.II с. г. у пам. Студ. Саюзу адбылася навуковая лекцыя гр. Ф. Акінчыца на тэму аграрнага пытаньня.

Арышт б. пасла Б. Тарашкевіча.

Польскія газэты падаюць, што б. пасол Б. Тарашкевіч, які пасьля ласкавага звальненьня з вастрогу выехаў заграніцу, польскай паліцыяй дня 6 г. м. арыштаваны.

Паводле газэтных вестак Тарашкевіч прабываў у Гданску, маючы сувязь з Менскам і Масквой.

Польскія ўлады даведаўшыся, што Тарашкевіч будзе ехаць з Гданску ў Маскву, пачалі за ім зорка сьлядзіць.

У пятніцу 6 г. м. Тарашкевіч вырушыў з Гданску праз Тчэў кур'ерскім транзытовым цягнікам у Рыгу.

На вакзале ў Тчэве (польская тэрыторыя), дзе цягнік стаіць 4 мінуты, камісар польскай паліцыі пачаў кантраляваць дакуманты пасажыраў і пазнаўшы Тарашкевіча папрасіў яго на пастарунак паліцыі. Тарашкевіч быццам нават і не спрацівіўся пайсьці з вагону на пастарунак паліцыі, дзе паліцыя, зрабіўшы рэвізію, арыштавала яго. У Тарашкевіча быццам знойдзены нейкія дакуманты, з якіх вынікае, што ён быў выкліканы Камінтэрнам у Маскву пісьмом ад Рак-Міхайлоўскага.

Тарашкевіч, як цьвердзяць газэты, пасаджаны ў турму ў Варшаве.

З літоўскага жыцьця.

Літоўска-бэльгійскае Т-ва. Газэты падаюць, што апошнім часам паўстала літоўска-бэльгійскае таварыства.

Літоўска-латвійскі школьны дагавор. 24 I. 31 у Рызе між Літвой і Латвіяй падпісаны дагавор, які здавольвае асьветныя патрэбы літвіноў у Латвіі і латышоў у Літве. Пры гэтым трэба адзначыць, што літвіноў у Латвіі тысяч 30, а латышоў у Літве—тысяч 16.

Т-ва моладзі „Вясна“. Літоўская моладзь у Незалежнай Літве мае сваю арганізацыю „Вясна“. Арганізацыя гэта вядзе вызатную грамадзкую работу і налічае яна 60 тысяч сяброў.

—о—

Дзень Незалежнасьці Літвы. 16 лютага кожнага году — гэта дзень Незалежнасьці Літвы. Віленскае літоўскае грамадзянства дзень гэты за прыкладам мінулых гадоў зьбіраецца сьвяткаваць урачыста найлепшым творам-драмай „Літвоманай“, а так-жа будзе зладжаны багаты канцэрт.

Эканамічныя труднасьці. З прычыны агульнага эканамічнага крызысу літоўскае Т-ва сьв. Казіміра закрыла дзіцячыя прытулкі: адзін у Віл.-Троцкім пав., а другі ў Браслаўскім. Зьліквідавана так-жа літоўская кнігарня ў Сьвянцянах.

Т-ва цьвярозасьці. 1. II. 31. у Вільні адбылася гадавая зборка літоўскага Т-ва цьвярозасьці. На гэтай зборцы зьвернута асаблівая ўвага на барацьбу з п'янствам на вёсцы. На чале гэтага таварыства стаіць кс. К. Чыбірас. — Не зашкодзіла-б, каб аб нечым падобным падумалі і беларусы.

З Польшчы.

У Сойме цяпер праводзіцца дыскусія над дзяржаўным буджэтам, які соймавая камісія прыняла ў агульнай суме 2.843.003.780 злотых.

У суботу 7 г. м. у часе дыскусіі дайшло да бойкі. Адзін пасол з клюбу Б. Б. ударыў па твары камуністычнага пасла.

Да другой бойкі дайшло ў часе дыскусіі над буджэтам мін. вайсковых спраў; пасьля вострай крытыкі буджэту паслом Арцішэўскім (П.П.С.), які сказаў, што кіраўнікі войска зьвяртаюць больш увагі на асабістыя справы, чым на збраеньне. Гэта дзеля таго, што міністар вайсковых спраў ёсьць адначасна генэральным інспэктарам арміі, прэм'ерам і дыктатарам і ня можа належна пасьвяціцца для арміі. Пасьля такіх прамоваў дайшло да бойкі між пасламі з Б.Б. і эндэцкімі.

У дыскусіі над буджэтам міністэрства ўнутр. спраў — пасол Голувко (ББ.) па свойму ў прамове „заапякаваўся“ справай беларускай. Пасол Ярэміч крытыкаваў пасла Голувку, дамагаючыся буджэту на беларускую асьвету.

Палітычныя працэсы з трагічнымі прыпадкамі. Польшча цяпер перажывае час вялікіх палітычных працэсаў. Не закончылася судовая расправа ў Варшаве ў справе змовы на маршалка Пілсудскага, у часе якой быў падстрэлены галоўны сьведка нейкі Пужыцкі, пачаўся суд 14 г. м. над 9 дзеячамі П.П.С., якія 14 верасьня 1930 г. зарганізавалі ў Варшаве веча. Мітынг гэты закончыўся страляніной. Тады было 2 забітых і 9 раненых, у гэтым ліку 5 паліцэйскіх.

Абвінавачаны: б. паслы Дзенгелеўскі

4)

Instrukcyi

Biełaruskaha Instytutu Haspadarki i Kultury.

1. Jak ładzić spektakli?

Moža najlahčej dla nowa-adkrytaha hurtka (pobač z pašyreńniem drukawanaha słowa) budzie zładzić spektakl wiečarynu (teatralnaje pradstaŭleńnie, pieśni, skoki). Takoje pradstaŭleńnie daje dwajnuju karyść: pašyraje biełaruskuju kulturu i daje siaki-taki dachod hurtku na roznyja patreby. Apradča siabroŭskich składak i ŭstupnych, inšaha dachodu badaj niama, dyk wielmi karysna ładzić biełaruskija spektakli, wiečaryny, tawaryskija hulni i inšyja zabawy.

Na spektakl patrebien dazwoł ad pawiatowaha starasty. Wybraŭšy pjesu i raździaliŭšy roli, urad hurtka pasyłaje prośbu da starasty mieniej-bolej u takoj formie:

Biełaruski Instytut
Haspadarki i kultury.
Hurtok u . . .
Dn. . . . . 193 . . h
Nr. . . . .

Panu Staraście . . . . . pawietu
u . . . . . .

Asnoŭwajučysia na §§ 4 i i 58 g Statutu T-wa Biełaruski Instytut Haspadarki i Kultury, hetym majem honar prasić ab wydańni hurtku Instytutu ŭ w. . . . . . . wołaści dazwolu na arhanizacyju teatralnaha pradstaŭleńnia ŭ wioscy . . . . u domie (budynku) . . . . dnia . . . miesiaca 193 . . h.

Adyhrana budzie kamedyja (drama, pjesa) . . . . . aŭtara . . . , jakoj 2 ekzemplary pry hetym dałučajem.

Paśla spektaklu buduć skoki, hulni. Dachod iz spektaklu pojdzie na mety Instyt.

Pačatak spektaklu a . . . h. . . . . .

Adkaznaść za wiečar biare na siabie Staršynia Ŭradu Hurtka hram. . . . .

Podpis:
Staršynia Ŭradu Hurtka.

Kali aproč pradstaŭleńnia buduć jašče deklamacyi abo kancert, treba prasić dazwołu i na deklamacyi i na kancert, dałučajučy da prośby pa 2 ekz. tekstu deklamacyjaŭ i pieśniaŭ.

Prośbu ab dazwoł treba padać u starastwa na 3 dni pierad spektaklam, a kali pasyłać poštaj, dyk radzicca pasłać (zakaznym piśmom) jak maha raniej, na jakija 2 tydni pierad spektaklam, prosiačy Starastwa, kab čymskarej prysłali dazwoł abo pawiedamili telefanična pastarunak palicyi ab dadzienym dazwole. Wielmi prykraja reč, kali ŭsio hatowa i ludzi sabralisia a dazwołu niama. Kali-b niešta padobnaje zdaryłasia, zaraz-ža pawiedamlajcie Centralu.

Prośba papolsku:

Białoruski Instytut
Gospodarki i Kultury.
Koło w . . . .
Dn. . . . 193 . . h
Nr. . .

Do Pana Starosty pow. . . . . .
w . . . . . .

Powołując się na §§ 4-i i 58-g Statutu T-wa Białoruski Instytut Gospodarki i Kultury, niniejszym mamy zaszczyt prosić o wydanie dla Koła Instytutu we wsi . . . . . , gm. . . . . zezwolenia na urządzenie przedstawienia teatralnego we wsi . . . . , w domu (budynku, sali) . . . . w dniu . . . miesiąca 193 . roku.

Odegrana będzie komedja (dramat, sztuka) . . . . , autora . . . . której 2 egzemplarze przy niniejszym załącza się.

Po przedstawieniu odbędzie się zabawa taneczna. ochód z wieczoru przeznacza się na cele Instytutu. Początek o godz. . . .

Odpowiedzialność za wieczór bierze na siebie prezez zarządu Koła . . . . . .

Podpis:
Prezes Zarządu Koła.

Kali prośba pasyłajecca ad hurtka Instytutu, to tahdy štemplowych marak nia kleicca, a kali ad prywatnaj asoby, to treba nakleić na prośbie na 3 zł. štemplowych marak.

(Teatralnyja twory dla spektaklu možna wypisać z bieł. kniharni „Pahonia“, Wilnia, Ludwisarskaja 1.)

Kali-b była mahčymaść, dobra było-b naładzić chor i dawać kancerty.

Chor možna arhanizawać biez dazwołu, na kancerty treba brać dazwoł.

Jak tolki źbiarecca trochi hrošaŭ, hurtok pawinien staracca załažyć biblijateku-čytalniu i wypisać biełaruskija hazety i knižki.

2. Jak adkrywać biblijateku-čytalniu?

Jak tolki ŭrad hurtka pastanowić adkryć biblijateku-čytalniu, pawinien jon pasłać zajawu da Starastwa hetkaha źmiestu;

(Štamp)

Panu Staraście . . . . . pawietu
u . . . . . .

Hetym majem honar pawiedamić Pana Starastu, što na padstawie § 4-k Statutu T-wa Hurtok Biełaruskaha Instytutu Haspadarki i Kultury ŭ w. . . . wol. . . . . adkrywaje biblijateku čytalniu ŭ wioscy . . . u domie hr. . . . (proźwišča haspadara i Nr. domu).

Zahadčykam i adkaznaju asobaju biblijateki-čytalni naznačany hr. . . . z wioski . . . wołaści .

U biblijatecy-čytalni buduć tolki lehalnyja knihi, hazety i žurnały ŭ biełaruskaj, polskaj i rasiejskaj mowie.

Staršynia Ŭradu Hurtka . . .
Sekretar Ur. Hurtka . . .

Kali ŭ praciahu 2-ch tydniaŭ nia budzie ad starasty nijakaha adkazu, to biblijateka-čytalnia ličycca zalehalizawanaj.

Zajawa papolsku:

Dn. . . . 193 . . r.
Nr. . .

Do Starostwa pow. . . . . . .
w . . . .

Niniejszem mamy zaszczyt uprzejmie zakomunikować, iż na podstawie § 4-k Sta-

Ходынскі, др. Будзінска-Тыліцкая, рэд. Сыновецкі і сябры міліцыі П.П.С.

У пятніцу на гэтай расправе трапіўся выпадак, іменна ў часе зазнаньня нагла памёр у судзе сьведка адвакат Корнфэльд. Абвінавачаная Будзінска-Тыліцкая дастала атак сэрца. З прычыны гэтага здарэньня суд прарваў разгляд справы. Абарона зажадала ўдаленьня старшыні суду. У аўторак 10 г. м. пачаўся разгляд справы бяз зьмены судзьдзяў. Абвінавачаныя адмовіліся ад абароны і ўсе адвакаты выйшлі з салі суду. Характэрна, што ў гэтым працэсе ведамы ўжо Пужыцкі фігуруе між галоўнымі сьведкамі абвінавачаньня.

Апрача гэтых, яшчэ вельмі цёмных спраў, дасьпявае і трэцяя, якую заграгічныя газэты называюць „найбольшым палітычным працэсам у Эўропе."

Дня 1 і 2 лютага ў Лодзі адбыўся кангрэс П.П.С. — лявіцы. Кангрэс адбываўся пры зачыненых дзьвярох. У часе прыняцьця, вельмі вострага характару, рэзалюцыяў у памешканьне кангрэсу ўвайшла паліцыя і арыштавала каля 350 асоб. Усе арыштаваныя разьмешчаны па турмах, а ўлады сьледчыя гатовяць акт абвінавачаньня, пасьля чаго пачнецца „найбольшы палітычны працэс у Эўропе."

А безрабоцьце ўсё расьце. За тыдзень ад 24 да 31. I. с. г. лік безработных у Польшчы ўзрос на 4113 асоб. Агулам безработных у ва ўсей Польшчы налічваецца 345.295 асоб.

З заграніцы.

Канфэрэнцыя аграрных дзяржаў. Румынскі ўрад склікае на 15 г. м. сяброў камітэту аграрных дзяржаў, у склад якога ўваходзяць: Баўгарыя, Эстонія, Мадзяршчына, Польшча, Румынія, Чэхаславаччына і Югаславія.

Нямеччына. Нямецкія народныя соцыялісты (гітляроўцы) ў саксонскім сойме дамагаюцца роспуску сойму. Свае дамаганьні гітлероўцы матывуюць тым, што сучасны стан у раздзеле мандатаў ня ёсьць згодны з воляй большасьці выбаршчыкаў у Саксоніі.

Індыя. Ведамы правадыр індыйскіх незалежнікаў Гандзі, які ангельскімі ўладамі быў пасаджаны ў вастрог за кіраўніцтва вызвольным незалежніцкім рухам у Індыі, 26 студзеня с. г. з вастрогу звольнены.

Вестка аб звальненьні папулярнага правадыра ўскалыхнула ўсю Індыю.

Варочаючагася з вастрогу Гандзі спатыкалі дзесяткі і сотні тысяч людзей.

Гандзі пасьля звальненьня з вастрогу заявіў, што ён споўніць „пасыўнае спраціўленьне" англійскім уладам толькі тады, калі Англія споўніць для Індыі наступныя дамаганьні:

1) Вольнасьць здабываньня і прадажы солі, 2. легалізацыя байкоту ўсіх заграгічных тавараў, 3. забарона вырабаў і прадажы індыйскай „нацыянальнай" гарэлкі, 4. паніжэньне залішне высокай індыйскай валюты, 5. зьмяншэньне на палову зямельнага падатку, 6. зьмяншэньне на палову ваеннага бюджэту Індыі, 7. зьмяншэньне на палову пэнсыі ўрадоўцам, 8. павышэньне платаў на заграгічныя тавары, 9. скасаваньне выключнага права англійцаў на судаходзтва па водах Індыі 10. поўная ліквідацыя „палітычнай" паліцыі, 11. вольнае права для ўсіх грамадзян насіць аружжа дзеля самаабароны.

На закіды з боку англійцаў, што гэтымі дамаганьнямі Гандзі заяўляе, каб англійцы выйшлі з Індыі, Гандзі адказаў—ня зусім так, а каб не маглі быць у Індыі, як валадары ды паны.

Ангельскі ўрад, відзячы стойкасьць індускіх незалежнікаў, пачаў над гэтай справай радзіць. Паклікаўшы на канфэрэнцыю „круглага стала" індыйскіх князёў, урад ангілійскі запраектаваў для Індыі конституцыю. Цяпер індускія князі, якія пад уладай ангельскай не найгорш чуюцца, выступілі з адозвай, накланяючай Гандзі згадзіцца на перагаворы і супрацоўніцтва з Англіяй.

Францыя перажывае сапраўдную эпідэмію банкавых банкруцтваў і дэфраўдацыяў, якія выяўляюцца ў вялізарнай суме. У рэгіянальным банку ў Нім выявіўся недабор 22 мільёнаў франкаў. У Штрасбургу два прыватныя банкі аб'явілі банкрот. Адзін прыватны банк у Воннае выказаў толькі паўтара мільёна прыходу, а пяць мільёнаў фр. расходу. У Парыжы паліцыя арыштавала аднаго прамыслоўца, які пад заставу дастаў пазычку 16 мільёнаў фр, і пасьля гэтыя грошы подступам атрымаў ад натаруса, дзе гэтыя грошы былі паложаны.

З Вільні.

ЛІКВІДАЦЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ. Прад Новым Годам зліквідавалася ў Вільні 22 прадпрыемствы. У працягу месяца студзеня зліквідавалася яшчэ 14. Такім чынам за апошнія часы зліквідавалася 36 прадпрыемстваў.

З краю.

ЗАРУБАЎ СЯКЕРАЙ 4 АСОБЫ. У в. Баяры, Беліцкай гм., Лідзкага пав. у ночы з 10 на 11 г. м. нейкі Б. Філіпчык раптоўна звар'яцеўшы зарубаў сякерай сваю жонку, цешчу і двух хлапчукоў.

КАБ АЖАНІЦЦА З ДРУГОЙ АТРУЦІЎ СВАЮ ЖОНКУ. У вёсцы Ласяны, Беніцкай гміны, Маладэчанскага пав., выкрыўся жудасны праступак. Ян Кандратовіч атруціў сваю жонку Алену мыш'яком, каб ажаніцца з палюбоўніцай. Вось да якой агіды даводзіць распуста!

СПРЫТНЫ АШУКАНЕЦ. Яшчэ ў першай палавіне 1930 году нейкі Красоўскі ў Баранавіцкім павеце зьбіраў рознымі спосабамі ахвяры на галадаючых. Красоўскі загадзя адкрыў на сваё імя конта ў П. К. О. у Варшаве. Рассылаючы падпісныя лісты ад імя арганізацыі Галоўнага К-ту Помачы галадаючым у Віленшчыне, падаваў нумар свайго конта. Такім чынам людзі добрае волі зложылі і пераслалі на паданае конта 1936 зл. і 74 гр. Аднак гэнае ашуканства выкрылася і незадоўга Навагрaдзкі акружны суд будзе судзіць ашуканца.

Усячына.

ЗОРКА, ЯКАЯ КОЖНУЮ СЭКУНДУ ЛЯГЧЭЕ НА 500 МІЛЬёНАЎ ТОН. Зорка Капелля, якая знаходзіцца між зоркамі Ориона і Зоркай Палярнай, аддаленая ад зямлі на 55 сьвятляных гадоў (сьвятло робіць у 1 сэкунду 300.000 клм.), ёсьць цяжэйшая ад сонца ў 4 разы і ў 14 разоў большая. Цяплыня паверхні гэтай зоркі дасягае 5000 градусаў, а ўнутры да 7 мільёнаў градусаў. Гэтай заваротнай гарачыні трэба бязупыннага праменяваньня ў безканечным прасторы сусьвету. Навука даказвае, што праменяваньне спалучана з утратай масы цела. Дзеля гэтага прыгожая Капельля мусіць губляць кожную сэкунду 500 мільёнаў тон свайго цела. Але каб яна праз праменяваньне зьнікла, на гэта трэба 500 мільярдаў гадоў. Не малая гэта нябесная куля, бо кубічны дэцымэтр гэтай зоркі важыць 2 грамы

ЗЕМЛЕТРАСЕНЬНІ. Дня 2 лютага с. г. Баварыю навясьціла землятрасеньне. У мяйсцовасьці Гоф ад землетрасеньня многа развалілася будынкаў. У мяйсцовасьці Ас так-жа адчулі землятрасеньне, ад якога развалілася некалькі будынкаў.

— Югаслаўскія газэты падаюць, што ад землятрасеньня ў Албаніі, якое навясьціла ваколіцы і месты Корыку некалькі дзён таму, развалілася больш 500 дамоў і згінула 400 людзей. Землятрасеньне трывала каля 20 мінут.

— У Новай Зэляндыі ў ночы з 7 на 8 г. м. паўтарылася землятрасеньне. У ваколіцах Непіра праз цэлы дзень 8 лютага адчуваліся здрыжкі зямлі, якія прычынілі вялікія матэр'яльныя шкоды. Ад здрыжак зямлі марскі бераг каля Непіра пачаў абваліваціца. Вялікія хвалі вады з мора затапілі вялікі абшар сушы.

ПРАДШЛЮБНЫЯ ЛЕКАРСКІЯ ПАСЬВЕДЧАНЬНІ. Газэты падаюць, што ў Польшчы скора будзе падгатаваны законапраект аб абавязку лекарскага пасьведчаньня да шлюбу.

Паводле гэтых вестак, у лік хвароб забараняючых жаніцца, будзе залічана і хвароба сухотаў.

У ВАРШАВЕ ЛІТОЎСКІ ПАЛАЦ. Заграгічныя газэты падаюць, што кн. Радзівілава падаравала свой палац у Варшаве літоўскаму ўраду.

tutu T-wa Koło Białoruskiego Instytutu Gospodarki i Kultury we wsi . . , gm. . . . .
otwiera bibliotekę czytelnię we wsi ....
w domu p.................. (prożwiščа i imia haspadara i Nr. domu).

Kierownikiem biblioteki czytelni i osobą odpowiedzialną naznaczony p.................. ze wsi..........gm..........

W bibliotece czytelni będą tylko legalne książki, gazety i tygodniki w języku białoruskim, polskim i rosyjskim.

Prezes Zarządu Koła..................
Sekretarz Zarządu Koła..........

Jak sabrać knihi i papaŭniać biblijateku?

a) Pažadana, kab siabry Hurtka i tyja hramadzianie, što majuć knihi, pazyčyli ich ŭ karystańnie biblijateki abo zusim achwiarawali.

b) Za siabroŭskija składki i za płatu za čytańnie Hurtok musić kuplać knihi, žurnały i wypiswać hazety.

c) Na pieršy pačatak Centrala Instytutu moža adpuścić u kredyt kamplekt knih, płatu za jakija Hurtok u wyznačany termin pawinien budzie ŭnieści choć častkami.

(Knihi možna wypiswać: Wilno Ludwisarska 1, Księgarnia Białoruska „Pahonia".)

Jakija dzieławyja knihi nieabchodny ŭ biblijatecy?

a) Kataloh — heta značyć śpis knih i žurnałaŭ, jakija majucca ŭ biblijatecy.

U katalozie ŭ asobnych rubrykach treba adznačyć: I — numar (Nr.) paparadku, II — aŭtara, III — nazoŭ knihi, IV — miesca i hod wydańnia, V — canu knihi.

Na pazyčanyja knihi pawinny być asobnyja raśpiski.

Na kožnaj knizie taksama pawinien być napisany paradkawy numar, pad jakim zapisana kniha ŭ katalozie.

b) Pawinien być sšytok dla zapisaŭ knih, jakija wydajucca čytačom. U hetym sšytku treba adznačwać imia i prożwiščа čytača, kali i jakaja kniha wydana, jaje Nr. i kali kniha wierniena.

c) Pawinna być **prychoda-raschodnaja kniha** dla zapisaŭ, kali, ad kaho, za što i jakaja suma pastupiła ŭ biblijateku, a taksama kali, kamu, za što i jakaja suma wydana.

Uwaha. Hetyja zapisy moža wiaści Skarbnik Hurtka, jakoha možna wyznačać i zahadčykam biblijateki.

Abawiazki adkaznaść zahadčyka.

Zahadčyk pawinien hladzieć:

a) kab majemaść biblijateki, h. zn. knihi byli ŭ poŭnym paradku, rasstaŭleny pa numaroch;

b) kab sam zahadčyk akuratna zapisaŭ knihi, jakija kuplajucca, ci achwiaroŭwajucca, ci pazyčajucca, a taksama kab akuratna zapisaŭ wydaču i zwarot knih;

c) kab akuratna ŭnosilisia hrošy za karystańnie knihami dy nadta doŭha nia trymalisia knihi čytačami;

d) kab za stračanyja i papsutyja knihi tymi ci inšymi čytačami unosiłasia wartaść ich;

e) kab akuratna wiałasia prychoda-raschodnaja kniha;

f) kab biblijateka papaŭniałasia nowymi knihami;

g) kab u biblijatecy nia było knih i hazet, zabaronienych uładaju;

h) za prawilnaść i akuratnaść wiadzieńnia biblijateki-čytalni niasie adkaznaść pierš za ŭsio zahadčyk, a zatym Hurtok ci Addzieł, pad kiraŭnictwam i apiekaju jakich znachodzicca biblijateka-čytalnia.

Chto nahladaje, kab biblijateka wiałasia prawilna i rewizuje jaje.

a) pierš za ŭsio nahladajuć siabry Hurtka i čytačy dziela swaich-ža ŭłasnych intaresaŭ;

b) asabliwa rupicca ab hetym Urad Hurtka, h. zn. Staršynia jaje.

c) Akružnyja Addziełу i Centrala ŭ Wilni majuć prawa rewizawać biblijateki-čytalni.

Chto i na jakich warunkach moža karystacca knihami z biblijateki i čytalni.

a) siabry Hurtka, h. zn. siabry T-wa B. I. H. i K. majuć prawa karystacca knihami zusim biasplatna, bo jany ŭnosiać siabroŭskija składki ŭ Hurtok;

b) tyja-ž asoby, jakija nie źjaŭlajucca siabrami Hurtka, za čytańnie płaciać stolki, kolki wyznačyć Hurtok, a prynamsi nia mienš jak 20 hrašoŭ u miesiac.

c) Kožny čytač, niezaležna ad taho, ci budzie jon siabram T-wa, ci nie, kali biare knihi da chaty, musić unieści załoh, raźmier jakoha ŭstanaŭlaje Hurtok T-wa.

Biblijatekaj-čytalniaj možna karystacca na miescy, a taksama pažyčać knihi da chaty. Treba, kab byli wyznačany hadziny, u jakija čytalnia-biblijateka adčyniena.

Likwidacyja biblijateki.

Kali-b z jakich-kolečy pryčyn biblijateka začyniałasia, to Hurtok, abo zahadčyk jaje, pawinien pawiedamić ab hetym Centralu, jakaja zrobić adpawiedny zahad, kudy dzieć knihi i dzieławyja zapisy biblijateki.

Uwaha. Zahadčykam biblijateki-čytalni i Narodnaha domu moža być asoba biaz rožnicy rodu majučaja poŭnych 21 hod.

Аб гаспадарцы.

Навука з прошлага 1930 г.

Ні ў якой іншай галіне жыцьця не аплачываецца гэтак добра погляд узад, як у гаспадарцы наагул, а ў земляробстве асабліва. Зробім пробу такога прыватна-гаспадарчага перагляду леташняга календарнага году і мы, каб ведаць, чым, як і кудой кіравацца ў гэтым годзе.

Леташні гаспадарчы год, ад пачатку да канца, прайшоў пад знакам вострага крызысу. Скажам больш: выдатныя людзі цьвердзяць, што сусьветны крызыс гаспадарчы мае свой пачатак і прычыну іменна ў земляробстве. У праўдзівасьць гэтага цьверджаньня ўваходзіць тут ня будзем, а прыглядзьмося толькі бліжэй, як разьвівалася прыватна—земляробская гаспадарка ў мінулым годзе.

Пачаўся леташні год пры ўмовах, калі ў земляробстве ледзь-ледзь можна было стачыць канцы з канцамі: за мэтрычны цэнтнар (6 пудоў і 10 ф.) жыта плацілі йшчэ каля 24—25 зл., а выкармліваньне сьвіней яшчэ аплачывалася сусём добра, бо за 1 клг. жыўца плацілі каля 2.50 зл. (40 зл. за пуд). Хутка аднак цэны пашлі раптоўна ўніз і на 1-га лютага за мэтр. цэнтнар жыта не плацілі ўжо больш, як 17 18 зл., а за кілё сьвінного жыўца пад канец ліпня ня больш, як 1.50 зл. (24 зл. за пуд). З надходзячай восеньню палажэньне на рынку не папраўлялася, падасьпеўшая на гэты час бульба ня мела таксама цаны. Нават малако і варыва ў летніх месяцах былі вельмі непаплатнымі. Недастатак гатоўкі праз цэлы мінулы год даваў неаграніченыя магчымасьці разросту дзікіх працэнтаў (ліхвярства) на пазыкі.

Было аднак сёе-тое ў гаспадарцы, што і аплачывалася. Напр. вішто сабе йшлі чарэшні, трускаўкі, яблыкі (асабліва зімовыя), сусём добра аплачываліся куры таму, хто гадаваў іх у большай лічбе і... з розумам, а не пастарасьвецку.

Прыглядаючыся бліжэй, можна сьцьвердзіць, што найбольш пацярпелі гаспадаркі ведзеныя „на стары лад“, асабліва-ж гаспадаркі на лёгкіх пяскох, дзе галоўнымі прадуктамі зьяўляюцца жыта і бульба. Цяжка таксама адчулі гаспадарчы крызыс гаспадаркі на падмоклых, а знача на незмэліораваных грунтох.

У проціўвагу гэным гаспадаркам, гаспадаркі кіраваныя паступова, а перадусім больш настаўленыя на гадоўлю свойскай жывёлы, адчулі гаспадарчы крызыс значна лягчэй. Агулам працягам мін. году прыходзімо да нязьбітнага вываду, што нястрымана прыбліжаемся да таго мамэнту, калі гаспадараньне пастарасьвецку, „на абыяк,“ ставецца найдаражэйшым, а ўсьлед за тым і проста немагчымым. Прыходзе пара, калі трэба будзе або працаваць усімі мазгамі і мускуламі, або... адмовіць сабе права жыць пачалавечаму. Гэта таму, што мы ўжо ўваходзім у пару, калі не хапае, як даўней, нейкую рэч толькі вырабіць: яе трэба вырабіць не абы-як, а добра, каб пасьля мець на яе купца. Інакш, выраб ня мае збыту і ўся праца йдзе намарна.

Сягоньня больш чым калі дагэтуль, трэба зьвярнуць увагу на якасьць выраблянага тавару. Што з таго, калі ў хляве стаяць худыя каровы, не даючыя ані малака, ані гною?*) Што з таго нібы „масла“, каторае „ў зубах расьце“ і па каторым чалавек заракаецца што яго больш ня возьме ў рот? Што з таго малака, у каторым поўна ўсякіх нячыстотаў і каторае насякшы „запахамі“ гною, нямытай і стараннa нявысушанай пасуды? Што з тых яйкаў, якія прадаюцца „дэтальна“ неразсартаваныя паводле вялікасьці, вонкавай чыстасьці, а галоўнае — сьвежасьці? Кожны такі тавар земляробскага вытворства, калі раз на рынку і ўдасца прапхнуць, дык „ашчасьліўлены“ ім спажывец „дзесятаму закажа“ есьці болей „жывое“ масла, піць шэрую, кісла-прэсную, цёплую „люру“, якая хоча звацца малаком, або есьці падазронага выгляду яйкі, якія па разьбіцьцю выдаюць „дзіўны“ запах, або ў якіх проста акажыцца... курчанё. Паўтараю: гэны спажывец „дзесятаму закажа“ і з кожным сваімі нагодамі падзеліцца і кожны таксама лепш будзе піць чорную каву, а хлеб будзе мазаць хоць-бы нейкай мармэлядай, але масла, яйкаў і малака не зачэпе.

Гэтак вузее рынак збыту прадуктаў земляробскага вытворства і таму гэтак страшна абніжаюцца на іх цэны.

З гэтага навука, каб усё на будучыню рабілася добра, чыста і сумленна. Сягоньнешні спажывец, у месьце асабліва, ахвотна даражэй за нешта заплаціць, але хоча затое мець і тавар запэўненай якасьці. Хто гэткі тавар патрапіць вырабіць, той хутчэй патрапіць вышукаць на яго і купца, той жыць будзе і гора не зазнае.

Калі праўду кажуць людзі, што прычыны сяньнешняга агульнага крызысу ляжаць у земляробстве, дык прычынай гэтай напэўна ёсьць і тое, што наша земляробства па „ваеннаму йшчэ ключу“ збудаванае і працуючае, выробляе прадуктаў за шмат, але гэтыя прадукты—ліхой якасьці. Выробляйма-ж іх у гэтым 1931-ым годзе менш, але самыя толькі добрыя: напэўна нам гэта аплаціцца. Гэтага нас вуча мінулы 1930 год!

Інж. Ад. Клімовіч.

*) гной ад худых кароў нікуды нярарты,

Да нас пішуць.

УЖО НАВАТ ІВЕЧАРЫНУ БЕЛАРУСКУЮ ТРУДНА ЗЛАДЗІЦЬ.

Будслаў, Вялейскага пав. Наш гурток Бел. Інстытуту Гаспадаркі і Культуры даволі інтэнсыўна працуе. Варункі да працы проста немагчымыя, але да гэтай пары было сяк-так. Цяпер-жа дык проста аніяк.

Наш гурток Інстытуту ўпляноваў наладзіць шырэйшую культурную працу. Пастанавіў сьпярша зладзіць беларускае прадстаўленьне ў вёсцы Палесі, каля Будслава. Каб быць у парадку з боку фармальнага, загадзя, бо 18.І. с. г. падалі просьбу ў Староства ў Вялейцы аб дазвол. Але гэтая справа без дазволу апынулася ў руках Будслаўскага каманданта паліцыі, які 24.І. с. г. прышоўшы з фахоўцам Грынявецкім да гаспадара хаты, у якой маецца адбыцца прадстаўленьне, заявіў — „ту бэндзе тэатр.“ Гаспадар, не зразумеўшы, чаго да яго зьявіўся камандант паліцыі, адазваўся ў абароне свае ўласнасьці. Тады камандант паклікаў прадстаўніка Будслаўскага гуртка Бел. Інст. Гасп. і Культуры, да якога зьвярнуўся з славамі — „цо пан ашукуеш владзэн“, просячы дазволу на спэктакль, ня маючы памешканьня. Але ў гэты час гаспадар хаты зразумеў аб што ідзе і тут-жа прад камандантам пацьвердзіў, што кватэру на ладжаньне беларускага прадстаўленьня даў і свайго слова не зьмяняе. Пасьля гэтага камандант заявіў, што гэная кватэра на спэктакль не адпаведная — ложка ёсьць у хаце, сцэны няма і няма вэнтыляцыі. Калі-ж прадстаўнік Інстытуту заявіў, што гэныя „бракі“ направіць — сцэну зробяць, ложка вынясуць, а для вэнтыляцыі адчыняць вакно, камандант знашоў яшчэ адну прычыну: „комін попэнканы“. Але і на гэта была рада: прадстаўнік Інстытуту заявіў, што паліць у печы ня будуць на спэктаклі. Тады камандант гэнае памешканьне „прызнаў“ агулам за „не надаёнцасенъ.“ На проціўцьверджаньне прадстаўніка Інстытуту камандант зьвярнуўся да „фахоўца“ Грынявецкага, які заявіў, што ён у гэтай справе нічога ня ведае, цьвердзячы, што „суфіт то высокі.“

Гэтая „камісія“ нешта напісала і камандант паслаў у Староства. На запытаньне ўраду гуртка Інстытуту, Староства на гэта да 4.ІІ. с. г. ніякага канкрэтнага адказу не дало.

Цярплівы.

МАЛЕНЬКІЯ „ПАРАДАЧКІ“.

Плюсы, Браслаўскага пав. Наша гміна знаходзіцца ўдоўж літоўска-польскай граніцы. Людзі спакойныя і добрыя, але вельмі бедныя. Сялянскія гаспадаркі ў большасьці малазямельныя. Кіруе самаўрадавым жыцьцём нашай гміны назначаны польскімі ўладамі войт, вайсковы капітан — паляк. Парадкамі нашай гміны сяляне не здаволены. Чуецца шмат нараканьняў на гмінныя „парадачкі“. Многія кажуць, што ў гміне трэба, каб быў свой чалавек войтам, г. зн. каб быў выбраны гміннай радай. Людзі нашы любяць чытаць беларускія газэты, хоць нацыянальная сьведамасьць беларуская тут слабая.

Д.

ФАЦЭТНЫЯ „ДАБРАДЗЕІ.“

Стаўпеччына. Няма горшае прыкрасьці ад насьмешкі ў вочы, уважаючы слухача за дурнога або малое дзіця. Вельмі сумна, калі бачыш, як хто найдаражэйшыя вартасьці народу стараецца зложыць у сваю заплясьнелую крамку, каб пасьля стаўшы ў дзьвярах яе прадаваць іх таму, хто болей дасьць, як свой ўласны тавар.

Гэтакую „прыемнасьць“ маральную адчуваюць многія беларусы цяпер у некаторых мяйсцох Стаўпеччыны.

У апошнія часы беларускія полёнофілы з пад сьцягу „Цэнтрасаюзу“ разаслалі па Стаўпеччыне свае „афэрты“ за пашырэньне беларускае культуры. Не гаворачы аб дармовых кніжках, абяцаюць нават плату: за памешканьне бібліятэкі, біліатэкару, а нават і за памешканьне, дзе прачытаецца па беларуску лекцыя.

Паночкі, ці вы насьміхаецеся з Стаўпецкіх беларусаў. Ці вы іх хочаце заплатай падпарадкаваць сабе, замыкаючы разьвіцьцё беларускае культуры ў сваю крамку санацыйнай палітыкі?

Калі вы шчыра адносіцеся да пашырэньня беларускае культуры, дык калі ласка— прысылайце беларускія кніжкі, а мы самі знайдзем бясплатнае памешканьне для бібліатэкі-чытальні ў вёсцы, залегалізуем яе адпаведна прад уладамі, знойдзецца так-жа бясплатны і бібліатэкар. Прыяжджайце і чытайце навуковыя лекцыі; за кватэру, дзе прачытаеце лекцыю, ні адзін чэсны беларус заплаты не патрабуе. Калі сапраўды вы так многа маеце грошай, што абяцаеце плаціць і за памешканьні і бібліатэкарам, дык лепш гэтыя грошы дайце на запамогу для выдавецтва новых беларускіх кніжак, а вясковыя беларускія працаўнікі зробяць у сябе на мяйсцох усё магчымае бясплатна. Вашы абяцанкі платы вельмі непрыемна адчуваюцца. Непрыемна аб гэтых рэчах пісаць, але яшчэ больш няпрыемна глядзець на парабкоў і чуць шуканьне наймітаў. Пара ўжо, каб беларусы былі самастойныя!

Самастойнік.

Наша пошта.

В. Худніцкаму. Гурток Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры можна адкрыць, калі ёсьць хоць 3 асобы, якія гэтага хочуць. Ад 18 гадоў усе могуць належаць да Інстытуту. Калі ў вас ёсьць, як Вы пішаце, 12 асоб моладзі, жадаючай беларускай арганізацыі, дык Вы неадкладна прысылайце заяву, паводле інструкцыі, у Цэнтралю аб адкрыцьці гуртка Бел. Інст. Гасп. і Культуры. Вам газэту пасылаем.

Рудко. Прэмію высылаем толькі тым, што прышлюць згары на цэлы год падпіску. Вам пасылаем кніжкі для пашырэньня друкаванага слова; як адкрыеце гурток Бел. Інст. Гасп. і Культуры, з гэтых кніжак заложыце пачатак бібліятэкі-чытальні.

А. Х-гу. Пасылаем Вам некалькі кніжак для пашырэньня сярод сялянства.

Вінцукевічу. Абяцанкі беларускіх полёнофілаў з пад сьцягу „Цэнтрасаюз“ —гэта заманка ў сваю полёнофільскую палітычную крамку. Дзеля шырэйшага азнаямленьня з гэтай акцыяй полёнофілаў прачытайце ў гэтым нумары карэспандэнцыю з Стаўпеччыны.

Полёнофілы, ня маючы доступу да народу з адкрытым чалом, прыкрываюцца цяпер культурнасьцяй і гэтакім спосабам стараюцца падыйсьці да народу. У тое, што яны сапраўды хочуць рабіць толькі культурна-прасьветную работу плацячы грошы працаўніком на вёсцы за іх мінімальную працу і за кватэру пад бібліятэку, мы ня верым. Гэта толькі падыход да вёскі. Калі яны прысылаюць кніжкі, браць можна і трэба. Маючы кніжкі залажыце бібліятэку-чытальню Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры; тады да Вас полёнофілы блізка не падойдуць і ня будуць мець ніякага ўплыву. За кніжкі ім падзякуйце і будзеце карыстаць.

Цярпліваму. Карыстаем, пішыце больш.

Самастойніку. Зьмяшчаем. Як даведываемся, санацыя начала сваю акцыю шырэй ня толькі каля Вас. Натугі іх і мы ўважаем за напрасныя.

Якубоўскаму. Карыстаем, пішыце аб жыцьці ў вашай староньцы.

Засьцянковаму. Атрымалі, скараціўшы і паправіўшы зьмесьцім. Друкі Інстытуту высланы. Учытывайцеся ў новую інструкцыю, якая друкуецца ў „Б. Крыніцы“. Гуртуйце сяброў.

Сергіевічу. Атрымалі вершы, дзякуем. Калі ня зможам зьмясьціць з браку мейсца, перададзём у „Шлях Моладзі“.

Алексу. Дзякуем, будзем карыстаць. Карэспандэнцыі выкарыстаем у наступных нумарох.

Грошы атрымалі ад: Д-р. М. Г,-Бучынскай 20 зл., К. Урбановіча 4 зл., М. Ліхута 4 зл., Ядвігі Беларус 4 зл., дзякуем прэмію. высылаем. Ад Ф. Сёмуха 2 зл., газэту будзем пасылаць.

Рэдактар Янка Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня. Выдавец Яака Шутовіч